# Глава IV. ОРГАНЫ КІРАВАННЯ ПА РЭАЛІЗАЦЫІ АГРАРНАЙ ПАЛІТЫКІ І АПЕКІ НАД СЯЛЯНАМІ

## 4.1. Міравыя пасрэднікі

*(А. П. Жытко, С. А. Талмачова)*

Органамі кіравання саслоўем сельскіх абывацелей з'яўляліся міравыя пасрэднікі, губернскія і павятовыя па сялянскіх справах установы, земскія начальнікі.

Для практычнай рэалізацыі рэформы 1861 г. была створана спецыяльная ўстанова на месцах – **інстытут міравых пасрэднікаў**[1]. Характар пераўтварэнняў шмат у чым залежаў ад механізму правядзення рэформы. Справа ў тым, што ў тагачаснай Расіі шматлікія пачынанні заканчваліся правалам і не дасягалі сваёй мэты. Адзін з аўтараў Рэдакцыйных камісій М. Мілюцін заяўляў: «*Весь успех великого дела будет зависеть от того, как оно будет приводиться в исполнение. Исполнение может исказить и обратить в мертвую букву лучшие намерения законодателя*»[2].

Пасрэднікі валодалі вялікім колам паўнамоцтваў як у адміністрацыйных, так і судова-натарыяльных справах. Асноўным іх абавязкам было рэгуляванне пазямельных адносін паміж сялянамі і памешчыкамі: увядзенне, а ў некаторых выпадках і складванне ўстаўных грамат, развярстанне ўгоддзяў, павышэнне ці паніжэнне павіннасцей, увядзенне выкупных актаў, спагнанне нядоімак і г. д., а таксама зацвярджэнне на пасадах асоб сялянскага самакіравання.

Да судовых спраў адносіўся разбор спрэчак, непаразуменняў і скаргаў на памешчыка, асобных сялян і органы сялянскага саслоўнага самакіравання. Натарыяльныя справы ўключалі засведчанне розных актаў, якія заключаліся паміж памешчыкамі і часоваабавязанымі сялянамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

---

[1] Журналы и мемории Общего собрания Государственного Совета по крестьянскому делу с 28 января по 14 марта 1861 г. – Пг.: Гос. тип., 1915. – С. 56.

[2] Семенов, Н. П. Освобождение крестьян в царствование императора Александра II : хроника деятельности Комиссии по крестьянскому делу : в 5 т. / [соч.] Н. П. Семенова. – СПб. : издание Меркурия Елеазаровича Комарова, 1889–1893 (в Государственной типографии). – Т. 3. – Ч. 1: Хроника деятельности комиссий по крестьянскому делу. – 1891. – С. 346.